фальклору, сведчыць аб яго мясцовых асаблівасцях. Выкарыстоўваючы фальклор у мастацкай творчасці, трэба мець на ўвазе яго спецыфічныя рэгіянальныя асаблівасці і імкнуцца дакладна адновіць іх у іншых галінах культуры.

Такім чынам, улік рэгіянальных асаблівасцей фальклору з'яўляецца магістральным накірункам у засваенні фальклорнай спадчыны.

Гуд П.А.,
канд. гіст. навук,
дацэнт

## БЕЛАРУСКАЕ КУПАЛЛЕ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

Купалле -- старажытнае беларускае свята летняга сонцастаяння, адроджанае ў пачатку 80-х гг. на аснове народных традыцый, апошнім часам стала шырока распаўсюджанай з'явай святочнай культуры Беларусі. Сацыялагічнае даследаванне паказвае, што за апошнія сем гадоў купалле ўвасаблялі ў 1986 і 1993 гг. адпаведна 18,1 і 73,2% культасветустаноў сістэмы Мінкульта РБ, прычым, калі на пачатку адраджэння (80-я гг.) свята арганізоўвалі эпізадычна, раз у 2--3 гады, то ўжо ў 90-х гадах адбылася стабілізацыя святочнага календара, і купалле сталі ладзіць штогод.

Аналіз матэрыялаў дазваляе зрабіць вывад, што ў рэчышчы свята працягваюць суіснаваць кампаненты, якія маюць эстэтычную каштоўнасць (песні, гульні, карагоды, карнавалізаваныя дзеі, вогненныя забавы). Аднак, як і на пачатку адраджэння, захоўваецца негатыўная тэндэнцыя правядзення купалля ў форме прадстаўлення, калі дзеянне ў вогнішча праводзіць нязначная колькасць ражаных, а большасць удзельнікаў з'яўляюцца пасіўнымі гледачамі, што рэзка зніжае эфектыўнасць эмацыянальнага і выхаваўчага ўплыву свята.

Працэс пераходу ад эпізадычнага ўвасаблення да масавага распаўсюджвання свята выявіў шэраг творчых і арганізацыйных праблем, якія перашкаджаюць далейшаму развіццю купалля. Галоўная праблема -- падрыхтоўка спецыялістаў у сферы народнай творчас-ці. Сацыялагічнае даследаванне паказвае, што 79% культработнікаў сельскіх клубаў і 68% супрацоўнікаў раённых метадычных цэнтраў культуры вельмі слаба арыентуюцца ў купальскіх народных традыцыях, звычаях, павярхоўна ведаюць агульнанацыянальныя рысы купалля, і амаль усе зусім не ведаюць мясцовых традыцый святкавання. Прычына гэтаму -- адсутнасць у большасці раёнаў рэспублікі сістэмы навукова-творчых семінараў па народнай абраднасці, недастатковая работа з фальклорнымі калектывамі, дрэннае наладжванне экспедыцыйнай палявой дзейнасці. Другая праблема -- склаўшыяся адносіны да працэсу сцэнарна-рэжысёрскай распрацоўкі свята. Большасць работнікаў клубных устаноў дагэтуль выкарыстоўваць гатовыя рэкамендацыі навукова-метадычных цэнтраў. Такая практыка ўдасканальвання методыкі і арганізацыі свята разам з распаўсюджваннем пазітыўнага творчага вопыту мае і негатыўнае адценне, таму што выхоўвае ў культработнікаў спажывецкія адносіны да падрыхтоўкі свята, пазбаўляе іх ініцыятывы, абмяжоўвае развіццё творчага патэнцыялу.

Адным з асноўных арганізацыйных пытанняў сучаснага купалля з'яўляецца тэрмін яго правядзення. Апошнія гады ў выніку пастановы Вярхоўнага Савета РБ аб святкаванні большасці народных свят па юліанскаму календару (каляды, дзяды і інш.) купалле таксама чамусьці сталі ладзіць у ноч з 6 на 7 ліпеня, што не адпавядае народнай традыцыі адзначэння даты летняга сонцастаяння (24 чэрвеня). Па народнаму календару пасля Пятра (29 чэрвеня) пачынаецца перыяд дажджоў, і таму ўжо ...ры гады запар свята, якое праводзіцца з 6 на 7 ліпеня, зрываецца або адмяняецца, што ўрэшце аказвае негатыўны ўплыў на развіццё купальскай абраднасці.

Далейшае ўдасканальванне сучасных народных свят, у тым ліку і купалля, тэрмінова патрабуе вырашэння наступных задач.

1. Увядзенне ў планы падрыхтоўкі спецыялістаў культуры спецыялізацыі «рэжысёр-фалькларыст».

2. Наладжванне раённымі метадычнымі цэнтрамі рэспублікі дзейнасці па збору мясцовага купальскага фальклору і арганізацыя пастаянна дзеючых навукова-творчых семінараў народнай творчасці.

3. Правядзенне купальскага свята ў рэгіёнах на аснове мясцовых традыцый.

4. Далучэнне да ўдзелу ў свяце шырокіх колаў насельніцтва.

5. Вяртанне свята ў традыцыйныя тэрміны правядзення.

Вырашэнне гэтых задач будзе мець жыватворны ўплыў на далейшае развіццё і ўдасканальванне народных свят, на якасны рост абрадатворчасці.

Міцкевіч Н.А.,
ст. выкладчык

## ЭЛЕМЕНТЫ КАРНАВАЛІЗАЦЫІ Ў ВЕСНАВЫХ СВЯТАХ БЕЛАРУСІ

Пачынаў веснавыя святы масленічны карнавал. Масленіца (масленка) -- гадавое свята, якое адзначалася як праводзіны зімы і сустрэча вясны. Назву «масленіца» мела не толькі свята, але і яго ўвасабленне -- смешнае чучала з саломы і ануч, прыбранае ў жаночае адзенне: кашулю, спадніцу. Масленічнае чучала -- гэта галоўны момант карнавалізацыі ў свяце.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Часам чучала прывязвалі да вялікага кала. Даводзілася, што ролю масленіцы выконваў чалавек, тады яго апраналі ў старое адзенне, малявалі вочкі, рабілі маску. «Масленіцу» вазілі ў санках, а за ёй з голасам і смехам бег народ. Чучала выносілі за вёску і там знішчалі: часцей спальвалі, іншы раз тапілі, разрывалі. Масленічнае вогнішча раскладвалася пад канец свята. Знішчэнне абрадавага чучала, здзекванне над ім заўсёды прымала форму гратэску і было асновай масленічнай карнавалізацыі. Праходзіла свята з незвычайным гоманам, задзірлівай музыкай, прытупваннем і крыўляннем. Гэта было жартоўнае дзеянне, дзе чучала масленіцы ўспрымалася як карнавальная маска.

Першага сакавіка лічыцца пачаткам вясны. У гэты дзень пачыналі спяваць веснянкі – «клікаць вясну». У Беларусі на сарокі (9 сакавіка) выпякалі сорак «жаваранкаў». Жаваранкі былі малыя, вялікія, з дужымі крыламі і мелі рысы карнавальнай лялькі. Дзіцячыя гульні з «жаваранкамі» ўзнаўлялі мінулыя абрадавыя дзеянні, дзе птушкі гралі ролю карнавальнай лялькі. Атрымаўшы «жаваранкаў», дзеці беглі з імі на вуліцу, у сады, агароды. «Жаваранкаў» клалі на галовы, трымалі ў руках, надзявалі на колікі як ляльку і бегалі з імі па сяле. Іх падкідалі ўгару з просьбай аб хутчэйшым прылёце птушак. Вясновае карнавалізаванае шэсце пачыналася з песень валачобнікаў. «Страла» -- сімвалічна рытуальная карагодная песня, у якой прысутнічаюць рысы карнавалізацыі. Хавалі «стралу» ў час каласавання азімага жыта, пры гэтым качаліся па жыце, закопвалі ў зямлю шпільку, пярсцёнак, маленькую анучную ляльку, якая сімвалізавала «стралу».

9 сакавіка ў сёлах «выганяюць зіму» на цэлы год, пры гэтым сяляне робяць са снегу бабу, малююць ёй твор, а пасля разбіваюць яе на часткі з патрабаваннем, «каб зіма не дзевяць месяцаў ад нас пайшла». Снегавая баба-лялька -- гіпербалічны вобраз, які ствараецца пры вялікім мностве людзей і мае магічную накіраванасць.

Свята «Куст» у асноўным захавалася на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Так, у Пінскім павеце на другі дзень троіцы збіраліся дзяўчаты ўсёй вёскі, выбіралі самую прыгожую дзяўчыну і прыбіралі яе: ў валасы ўплятамі мноства рознакаляровых стужак, шыю і грудзі ўпрыгожвалі штучным жэмчугам, на галаву надзявалі даволі вялікі вянок са штучных кветак, а твар закрывалі белай вуаллю. Прыбраная такім чынам дзяўчына называлася кустом, які і вадзілі па вуліцах цэлым гуртом. Гэты карнавалізаваны момант пераапранання з'яўляецца асноўнай рысай свята.

Русальная нядзеля пачыналася праз тыдзень пасля семухі. У гэтую нядзелю дзеўкі робяць ляльку з «маю», называюць яе русалкаю. Потым носяць тую русалку з песнямі па полю, а вечарам падыходзяць да ракі і кідаюць ляльку ў ваду. Гэта завецца «таніць русалку». Раней выбіралі самую прыгожую дзяўчыну, убіралі яе ўсю зялёнымі галінамі ды рознымі краскамі. Звалі яе русалкаю. У сяле Юркевічы «русалку» рабілі з саломы. Беларускі абрад «праводзіны русалак» быў прадстаўлены ў адзіным напрамку -- «русалку» заўсёды праводзілі ў жыта. На Беларусі вялікае значэнне надавалася русальнай нядзелі, якая складалася з наступных карнавалізаваных момантаў: прыбіранне дзяўчат русалкамі, стварэнне лялькі-русалкі з саломы ці снапа жыта, карнавальныя «праводзіны русалкі» са спевамі, гульнявымі элементамі.

У беларусаў на вялікдзень увечары па дварах і хатах хадзілі групы валачобнікаў. У гэтым валачобным абрадзе, як і калядным, прысутнічаў момант прадстаўлення з элементамі карнавалізацыі.

**Гуд Н.І.,**
**ст. выкладчык**

## РОЛЯ ФАЛЬКЛОРУ Ў ЛЕТНЕ-АСЕННІХ СВЯТАХ БЕЛАРУСАЎ

Летне-асенні земляробчы каляндар беларусаў завяршаўся жнівом, якое з'яўлялася галоўным этапам у гаспадарчай дзейнасці земляроба.

У жніўных абрадах і песнях песна перапляліся ідэі земляробчага календара -- пачатак і завяршэнне, завяршэнне і пачатак. Гэта і пачатак збору ўраджаю, і завяршэнне доўтага чакання. Гэта і пачатак новага гадавога круга, які павінен забяспечыць будучы ўраджай, і пачатак адраджэння і абнаўлення жыццёвых сіл зямлі, прыроды, чалавека.

Вялікае месца ў жніўных абрадах займаюць магічныя дзеянні і заклінанні, з дапамогаю якіх жнеі імкнуліся вярнуць ніве яе жыватворную сілу, а таксама засцерагчы ўраджай, своечасова яго сабраць, захаваць жыццё, здароўе, шчасце членаў сям'і.

Многія элементы абрадавай сістэмы жніўнага цыкла з'яўляюцца агульнымі для ўсяго календара: падрыхтоўка жылля для сустрэчы дарагога госця -- ўраджаю, святочная вопратка і абутак, прынашэнні ніве і абрадавая ежа на застоллі, магічныя дзеянні і заклінанні, славесныя формулы і песні. Многія песні жніўнага цыкла маюць аналогію з калякднымі, валачобнымі, юр'еўскімі, купальскімі і вясельнымі песнямі. У асноўным гэта песні з паэтычнай ідэалізацыяй ураджаю. Тут паўтараецца характэрны для ўсёй абрадавай паэзіі скразны метафарычны вобраз багатага ўраджаю, якога чакае земляроб. Многія песні не толькі ўваходзяць у рытуал, але і самі становяцца рытуалам. У іх даецца дакладная інфармацыя аб часе правядзення, рэаліях, а таксама ўказваецца культура, з уборкай якой яна звязана.

Вялікую групу песень складаюць спарышовыя і райковыя песні, якія даюць прыклад узаемаадносін і ўзаемасувязі спарыша (рая і бога) і развіваюць матыў запрашэння ў дом дарагога госця - ўраджаю.